**“Эстафета пакаленняў: захоўваючы мінулае, ствараем будучыню”**
**Першы ўрок 2025/2026 навучальнага года (9 клас)**

**Алена Аляксандраўна Чарнавус**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”
Радунскай сярэдняй школы
Воранаўскага раёна

**Працуючы калектыўна і ў групах над тэмай першага ўрока навучэнцам з прапанаваных гексаў неабходна скласці гексаграму “Эстафета пакаленняў”, пракаменціраваць свой выбар.**

**Тэма: “Эстафета пакаленняў: захоўваючы мінулае, ствараем будучыню”**

**Задачы:** фарміраваць разуменне значнасці традыцый і дасягненняў беларускага народа, іх захаванне і перадачу нашчадкам; выхоўваць павагу да гістарычнай і культурнай спадчыны беларускага народа, усведамленне асабістай адказнасці за захаванне памяці.

**Абсталяванне:** эпіграф**,** гексы, выстава кніг беларускіх пісьменнікаў на ваенную тэму, маркеры.

**Ход урока**

*Народ, які забыў сваё мінулае, гэта народ,*
*які страціў памяць.*
*А чалавек без памяці – гэта хворы чалавек.*
В. Быкаў.

**I. Арыенціровачна-матывацыйны этап**

**Настаўнік.** Вітаю вас, дарагія дзеці, на першым уроку ў новым 2025/2026 навучальным годзе. Жадаю новых адкрыццяў, яркіх момантаў, вялікіх і маленькіх перамог! Наш першы ўрок мне хацелася б пачаць словамі Васіля Быкава: “*Народ, які забыў сваё мінулае, гэта народ, які страціў памяць. А чалавек без памяці – гэта хворы чалавек*”. Як вы разумееце гэтыя словы? *(Настаўнік слухае меркаванні вучняў.)*

**Настаўнік.** Дзякую за вашы адказы, прапаную паразважаць над выказваннем на працягу нашых заняткаў і падзяліцца сваімі думкамі напрыканцы ўрока, тэма якога гучыць так: “**Эстафета пакаленняў: захоўваючы мінулае, ствараем будучыню**”.

**ІІ. Аперацыйна-пазнавальны этап**

- ***Прыём “Дэкадаванне фота”.***

Франтальная гутарка

**Настаўнік.** Звярніце ўвагу на фотаздымак, апішыце яго. *(Дадатак 1)* Каго вы бачыце на фота? Людзей якога ўзросту вы бачыце, што яны трымаюць у руках? Які настрой і выраз твару ў людзей? Як бы вы назвалі гэты фотаздымак? (*Настаўнік арыентуе клас на прыкладны адказ наконт назвы фотаздымка: “Эстафета пакаленняў”.)*

**Настаўнік.** Многія з вас прымалі ўдзел у розных спартыўных спаборніцтвах. Як вы разумееце слова “эстафета”? *(Адказы вучняў.)*

**Настаўнік:** Сапраўды, эстафета – гэта гульня, у якой каманды перадаюць адзін аднаму эстафетную палачку або факел падчас забегу. Кожны ўдзельнік каманды бяжыць вызначаную адлегласць, а пасля перадае эстафету наступнаму. Эстафета пакаленняў – гэта сімвалічнае значэнне, якое мае на мэце перадачу ведаў, вопыту, традыцый, каштоўнасцей аднаго пакалення другому. Сёння на ўроку мы будзем складаць гексаграму “Эстафета пакаленняў”. У якасці эстафетнай палачкі ў нас будуць выступаць гексы.

- ***Прыём “Знайдзі эстафету”.***

Работа ў групах

**Настаўнік.** З прапанаваных гексаў знайдзіце тыя, якія адлюстроўваюць паняцце “эстафета пакаленняў” *(Дадатак 2)*. Што мы атрымалі ў спадчыну ад продкаў і павінны захаваць для нашчадкаў? Размясціце выбраныя гексы на дошцы і пракаменціруйце свой выбар. *(У цэнтр гексаграмы настаўнік размяшчае фота “Эстафета пакаленняў”, выбраныя вучнямі гексы размяшчаюцца вакол.)*

**Настаўнік.** Размешчаная інфармацыя ў гексаграме яшчэ раз падкрэслівае той факт, што нам засталася багатая культурная, навуковая, гістарычная спадчына ад нашых продкаў. Якім будзе яе далейшы лёс залежыць ад кожнага з нас. Менавіта таму на гексаграме я прымацоўваю гекс з надпісам “Мая эстафета”, да якога мы звернемся крыху пазней. У вас засталіся нявыбраныя гексы, будзьце ўважлівымі, яны спатрэбяцца вам для дапаўнення інфармацыі ў гексаграме.

**Франтальная гутарка**

А зараз увага на выставу кніг. Прачытайце словы Алеся Адамовіча, якія размешчаны над выставай:

*“Мы павінны гаварыць пра вайну. Усё. Да апошняга слова. Бо гэта апошняе, што мы можам зрабіць для тых, хто застаўся там”.* Як вы думаеце, якой тэмай аб’яднана выстава кніг і як вы разумееце словы А. Адамовіча? *(Выстава аб’яднана тэмай вайны, пра якую пісалі В.Быкаў у вывучаных творах “Жураўліны крык”, “Незагойная рана”, М. Лынькоў у*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*“Васільках”і многія іншыя. Алесь Адамовіч звяртаецца да нас з заклікам гаварыць пра вайну, памятаць пра герояў, якія назаўсёды засталіся ахвярамі фашызму, памятаць і не забыць – наш святы абавязак. Маўчанне – гэта здрада тым, хто заваяваў перамогу і блакітнае неба 80 гадоў назад.)*

**Настаўнік.** Знайдзіце сярод гексаў той, які адлюстроўвае факт балючай гістарычнай спадчыны і размясціце на дошцы. *(Група, у якой знаходзіцца гекс, размяшчае яго на дошцы. Дадатак 3.)*

**Фізкультхвілінка**

**Настаўнік** *(фонам гучыць спакойная музыка)*. Сядзьце зручна, заплюшчыце вочы. Уявіце сабе вялікае дрэва. Яго моцныя карані – гэта наша мінулае, гісторыя. Ствол – гэта мы, сучаснікі. Галінкі, што цягнуцца да сонца – гэта наша будучыня. Падумайце, што вы адчуваеце знаходзячыся на гэтым дрэве? Можа, хто-небудзь – моцны корань, хтосьці малады лісток. Агучце свае ўяўленні. *(Вучні дзеляцца ўяўленнямі.)*

**Настаўнік.** А зараз зноў прапаную папрацаваць у групах і пабыць у розных ролях: 1-я група “Захавальнікі памяці”, 2-я група “Асэнсавальнікі сучаснасці”, 3-я група “Будаўнікі будучыні”. Кожнай групе прапаную матэрыял для працы, пры дапамозе якога вы дапоўніце гексаграму па сваёй тэматыцы і пракаменціруеце свой выбар.

*Заданне для 1-й групы “Захавальнікі памяці”. Адкажыце на пытанні: Чаму мова – гэта больш, чым сродак зносін? Чаму традыцыі – гэта не проста старамодныя абрады? Раскажыце пра традыцыі, звычаі вашай сям’і. Ці ёсць рэліквіі ў вашых сям’ях? Як яны захоўваюцца?*

*Гексы, якія выбірае 1-я група (Дадатак 4).*

*Заданне для 2-й групы “Асэнсавальнікі сучаснасці”. Адкажыце на пытанні: Якія галоўныя навуковыя і тэхналагічныя дасягненні сучаснай Беларусі вы лічыце візітнай карткай краіны? Якія аб’екты вам ужо давялося наведаць? Гексы, якія выбірае 2-я група (Дадатак 5).*

*Заданне для 3-й групы “Будаўнікі будучыні”. Адкажыце на пытанні: Што спрыяе добраўпарадкаванню будучыні нашай краіны сёння? Што вы ведаеце пра Пяцігодку Якасці і пра Год добраўпарадкавання? Якія змены адбыліся ў вашым пасёлку/горадзе, школе, двары ў 2025 годзе?*

*Гексы, якія выбірае 3-я група (Дадатак 6).*

Прэзентацыя работы груп.

**III. Этап падвядзення вынікаў. Рэфлексія**

**Настаўнік.** Як бачым, наша гексаграма папоўнілася інфармацыяй. А гэта значыць, што эстафета пакаленняў працягваецца, мы з вамі таксама звяно ў гэтым ланцужку. Што б вы дадалі ў гэтую эстафету пакаленняў, каб перадаць нашчадкам? Прапаную вам дапісаць адказ на гэта пытанне ў прапанаваныя гексы і агучыць. Адказ у кожнага будзе пачынацца словамі: “Я хачу

захаваць…”. Напрыклад: “Я хачу захаваць сваю мову і культуру, бо без мовы народ знікае. Я хачу захаваць бясплатную адукацыю ў школе, таму што адукацыя патрэбна ўсім”.

*Гексы для адказаў на пытанне гл. Дадатак 7.*

Адказы на пытанні вучні агучваюць і размяшчаюць у гексаграме пад гексам “Мая эстафета”.

**Настаўнік.** Такім чынам, эстафета пакаленняў – гэта наша штодзённая праца на карысць сям’і, школы, месца працы, на карысць дзяржавы. Ведаць гісторыю, мову, знакамітых суайчыннікаў, ганарыцца дасягненнямі навукі сваёй краіны, захоўваць традыцыі і культуру – усё гэта наш выбар і абавязак. Толькі шануючы мінулае, мы зможам пабудаваць будучыню. Звернемся да эпіграфа, якім пачыналі наш урок. Падзяліцеся цяпер сваімі развагамі наконт сэнсу слоў Васіля Быкава.

**Настаўнік:** А я хачу падзякаваць вам за працу і скончыць наш урок словамі Якуба Коласа: *“Ідзі наперад, не спыняйся на дасягнутым, бо спыненне – гэта шлях да заняпаду”.*

## Літаратура


1. Адамовіч, А. “Я з вогненнай вёскі…” : [зборнік] / А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. — 447 с.
2. Таямніца слова. Літаратурна-мастацкая творчасць : дапаможнік / Г. К. Тычко. – Мінск : БДУ, 2016. – 175 с.
3. https://vospitanie.adu.by


*Дадатак 1*



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*Дадатак 2*




*Дадатак 3*




ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*Дадатак 4*









ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*Дадатак 5*

*Друкаваная інфармацыя размяшчаецца на адваротным баку фота.*



*Беларусь – касмічная дзяржава. Марына Васілеўская – першая жанчына-касманаўт у гісторыі беларускай суверэннай дзяржавы, якая пабывала на арбітальнай станцыі. Касмічная галіна Беларусі ўносіць значны ўклад у эканоміку краіны. Інфармацыя, якая атрымліваецца праз сістэму дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, выкарыстоўваецца для прагнозу надвор'я, ацэнкі стану лясоў, прадухілення пажаранебяспечных сітуацый, вывучэння кліматычных змяненняў, прагназавання ўраджайнасці.*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА




*У Беларусі паспяхова рэалізуецца курс на пабудову IT-краіны і пераход да лічбавай эканомікі. Парк высокіх тэхналогій (ПВТ) створаны ў 2005 годзе. Сёння ПВТ лічыцца вядучым IT-кластарам у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, які прапануе лепшыя ўмовы для адкрыцця, вядзення і развіцця бізнесу. Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідараў па экспарце IT-паслуг на душу насельніцтва, а мабільныя дадаткі, створаныя рэзідэнтамі беларускага Парка высокіх тэхналогій, выкарыстоўваюць каля мільярда чалавек больш чым у 190 краінах свету. .*

НАЦИОНАЛЬНЫЙ
ДЕТСКИЙ
ТЕХНОПАРК

*Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк створаны ў 2021 годзе.*
*У ім штогод больш за 1500 навучэнцаў IX–XI класаў праходзяць навучанне па адным з 15 напрамкаў, сярод якіх "Авіякасмічныя тэхналогіі", "Віртуальная і дапоўненая рэальнасць", "Зялёная хімія", "Інжынерная экалогія", «Біятэхналогія». Лепшыя выпускнікі могуць паступаць ва ўстановы вышэйшай адукацыі без экзаменаў па рэкамендацыі Наглядальнага савета і выніках субяседавання.*

NG PRESS ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА



*Знакавай падзеяй для Рэспублікі Беларусь стала ўвядзенне ў прамысловую эксплуатацыю ўласнай атамнай электрастанцыі (АЭС).*
*Галоўная задача энергетычнага комплексу Рэспублікі Беларусь – выкарыстанне мясцовых відаў паліва, уключаючы торф. Рэспубліка Беларусь з мэтай атрымання энергіі выкарыстоўвае аднаўляльныя крыніцы: ваду, вецер і сонца. Самая вялікая ў Беларусі сонечная электрастанцыя магутнасцю 55 МВт адкрыта недалёка ад Рэчыцы.*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*Дадатак 6*




Прэзідэнт Беларусі А. Р. Лукашэнка 17 студзеня 2025 г. падпісаў Указ № 31, якім 2025–2029 гады аб'яўлены пяцігодкай якасці. Прыярытэтныя мэты пяцігодкі – далейшае павышэнне якасці жыцця людзей, канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, удасканаленне грамадскіх адносін. Павінны быць забяспечаны даступнасць і высокія стандарты адукацыі, медыцынскай і сацыяльнай дапамогі, інфраструктуры, тэлекамунікацый.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА




Рэспубліканская акцыя "Вахта памяці-2025" прымеркавана да Года добраўпарадкавання і святкавання 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Праводзіцца ва ўстановах адукацыі краіны ў перыяд з красавіка па лістапад 2025 года.

Сярод мерапрыемстваў акцыі запланавана:

➢добраўпарадкаванне і навядзенне парадку на тэрыторыі воінскіх пахаванняў і месцаў увекавечання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны, пасадка дрэў, памятных алей, сквераў, садоў;

➢урачыстыя мітынгі ля воінскіх аб'ектаў з ускладаннем кветак.

*Дадатак 7*

***Я хачу захаваць…***

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА